26 891




# МАЗЫР МОЗЫРЬ



**Мазыр. Мозырь / текст М.П. Ермакова. – Минск : Беларусь, 1977. – 75 с.**

РАНІЦА… Над Мазыром устае зара, ажываюць вуліцы, на будоўлях пачынаюць працаваць вужавыя краны. Пабеглі па Прыпяці шустрыя катэры, важна папаўзлі баржы… У розныя канцы краіны адпраўляе горад сваю прадукцыю – кабель і меліярацыйныя машыны, трыкатаж і мэблю, швейныя вырабы і бензін, мазут і будаўнічыя матэрыялы.

Усё вышэй устае над Мазыром сонца, усё ярчэй асвятляе збягаючыя з узгоркаў вуліцы і зялёныя паркі, прасторныя плошчы і бульвары, дзіўныя ансамблі, у якіх арганічна спалучаюцца сучасныя будынкі і сівая даўніна.

Мазыр – адзін са старажытнейшых гарадоў беларускага Палесся. Упершыню ён упамінаецца ў летапісе 1154 года.